Новая лагістыка турыстычнай жамчужыны

Сюрпрыз для велатурыстаў

Населены пункт — свайго кшталту брама ў турыстычную Мекку Гродзеншчыны. У рамках трансгранічнага праекта тут адкрыты інфармацыйны цэнтр, дзе можна атрымаць даведкі і карты маршрутаў. Таксама тут могуць арганізаваць экскурсіі і прапанаваць культурна-турыстычныя паслугі, пазнаёміць з традыцыямі і народнымі промысламі.

Сёлета на базе культурна-турыстычнага цэнтра пачаў дзейнічаць яшчэ і пракат роваў.

— Мы працуем штодзённа. У нашым парку 20 роваў, як «дамскіх», так і звычайных. Ёсць таксама дзіцячыя і адзін электраровар. Ён працуе на акумулятарах, мае міні-камп'ютар — гэта для нас навінка, — кажа **загадчык Сапоцкінскага культурна-турыстычнага цэнтра Ганна ГАЛУБЦОВА.**

У гэтым сезоне Аўгустоўскі канал стаў па-сапраўднаму суднаходным. Нядаўна ён быў уключаны ў рэестр водных шляхоў краіны, што дае магчымасць курсіраваць тут усім відам суднаў, а не толькі маламерным, як было раней.

Усяго па трансгранічным праекце атрымана 100 адзінак. Большая частка перададзена на Аўгустоўскі канал і знаходзіцца на балансе прадпрыемства па абслугоўванні канала. Тое, што пункт пракату адкрыты яшчэ і ў Сапоцкіне, вельмі важна для турыстаў, лічыць кіраўнік цэнтра. Цяпер лагістыка значна палепшылася. Аматар велавандровак можа без праблем даехаць з Гродна да Сапоцкіна — транспарт ходзіць даволі часта — і адсюль на арандаваным ровары накіравацца да канала.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Мы спадзяёмся, што будзе адкрыты і сезонны пункт пропуску. Турысты змогуць праехаць і па міжнародным маршруце. У апошнія гады веларух відавочна ажывіўся, шмат было замежных грамадзян, прыязджалі на роварах цэлымі групамі, сем'ямі, — кажа суразмоўніца.

Ёсць карацейшы маршрут!

Цяпер дабрацца да канала зможа кожны, хто ўмее круціць педалі. Чаму б не пракаціцца з ветрыкам? Тым больш што турыстычны сезон нібыта ўжо і пачаўся...

Аказалася, што карэспандэнт «Звязды» — першы турыст, які збіраецца здзейсніць такі шпацыр на ровары першага ў Сапоцкіне пункта пракату. Ганна Галубцова прапануе на выбар дамскі, звычайны альбо электрычны. Выбар за звычайным новенькім «горнікам».

Ад Сапоцкіна да шлюза Дамброўка, які лічыцца самым «абжытым», па асфальце каля 10 кіламетраў. Для пачаткоўца шлях не вельмі блізкі. Супрацоўніца прапануе карацейшы маршрут і нават згаджаецца суправаджаць. Папярэджвае, што шлях будзе праходзіць з пад'ёмам, а затым па гравійцы — затое толькі 3-4 кіламетры. Палічыўшы, што з гэтым справіцца і пачатковец, мы рухаемся па маршруце.

Адразу за населеным пунктам пачынаецца пад'ём. Дарэчы, усё наваколле тут даволі ўзгорыстае. Дарога, вядома, не вельмі крутая, тым не менш частку пад'ёму даводзіцца прайсці пешшу. Затое страчаны час можна нагнаць на спуску. Яшчэ кіламетр трэба трэсціся па гравійцы, а потым — спакойная лясная дарога пад птушыны гоман.

Неўзабаве відаць суднаходны шлюз Дамброўка. Дарэчы, праект будаўніцтва гідратэхнічнага збудавання даўжынёй 100 кіламетраў быў падпісаны імператарам Аляксандрам I амаль два стагоддзі таму. Яшчэ 15 гадоў доўжылася будаўніцтва. У выніку з'явіўся водны шлях, які злучыў Віслу і Нёман.

У гэтым сезоне Аўгустоўскі канал стаў па-сапраўднаму суднаходным. Нядаўна ён быў уключаны ў рэестр водных шляхоў краіны, што дае магчымасць курсіраваць тут усім відам суднаў, а не толькі маламерным, як было раней.

Цеплаход «на прыколе»

На прычале Дамброўкі стаіць цеплаход «Нёман». Капітан Аляксандр Кірэня пакуль без работы. Кажа, што сезон яшчэ не пачалі, хоць летась заяўкі сыпаліся ажно з сакавіка — сезон быў распісаны загадзя. Было зроблена каля 600 рэйсаў, на кожным па 50 турыстаў. Большасць з іх — замежнікі з Літвы і Польшчы, якія скарысталіся бязвізавым рэжымам.

Каб вывесці цеплаход на маршрут, трэба як мінімум 20 чалавек — тады кошт білета будзе прымальны, бо гадзіна арэнды каштуе 380 рублёў. Звычайна на борт падымаецца 40—50 пасажыраў. Цяпер такую колькасць складана забяспечыць, у тым ліку па санітарных нормах.

Які будзе сёлетні сезон, пакуль цяжка казаць. Эпідэміялагічная сітуацыя, звязаная з каранавірусам, унесла значныя карэктывы ў турыстычны бізнес.

Падобная сітуацыя і з аграсядзібамі, якіх тут з дзясятак. Гаспадыня адной з іх — Наталля Канюшок — выдае ў пракаце ровары. У яе агратурыстычным бізнесе поўны штыль — нават тыя, хто браніраваў на лета, адмовіліся. А вось альтанкі ўздоўж канала карыстаюцца добрым попытам і ў выхадныя дні ўсе занятыя. У асноўным прыязджаюць невялікімі групамі альбо сем'ямі.

За актыўны адпачынак

Гродзенцы Сяргей, Таццяна і іх дачка Вольга пачулі па радыё, што на канале адкрыты велапракат, і адразу ж прыехалі. Падчас велашпацыру пабывалі на суседнім шлюзе Нямнова. Гэта самы вялікі, трохкамерны шлюз, каля яго знаходзіцца база турыстаў-воднікаў, таксама ўладкаваны парк актыўнага адпачынку. Цяпер база таксама пустуе. Затое, кажа Таццяна, можна ў поўнай ступені атрымаць асалоду ад цудоўнай прыроды, відаў канала і свежага паветра.

Цяпер дабрацца да канала зможа кожны, хто ўмее круціць педалі. Чаму б не пракаціцца з ветрыкам? Тым больш што турыстычны сезон нібыта ўжо і пачаўся...

— Раней я таксама часта была на канале. Тут праводзіцца шмат мерапрыемстваў, фестываляў, мы з хорам выступалі. Цяпер адчуваю, што трэба адпачываць актыўна, тым больш што гэта не толькі карысна, але і прыемна. Ды і ровары вельмі зручныя — не тое што ў маім дзяцінстве, калі мы малыя ганялі па вёсцы. Тады гэта быў самы папулярны від транспарту як у дзяцей, так і дарослых. Тое, што ранейшая традыцыя зноў вяртаецца, вельмі добра, — дзеліцца сваімі думкамі Таццяна.

Між тым нельга сказаць, што на Дамброўцы бязлюдна. Мужчына, напрыклад, вудзіць рыбу каля плаціны, па мосце гуляюць маладыя сем'і з дзецьмі, хтосьці скарачае шлях да вёскі. У цёплае надвор'е сюды, безумоўна, з'едзецца не адзін дзясятак турыстаў. У гэты час ажываюць і гандлёвыя палаткі. А яшчэ тут можна наведаць музей канала, які не так даўно адкрыты ў былым доме назіральніка. З'явілася і новая інсталяцыя — каваная брама, на якую ўжо паспелі павесіць некалькі замкоў — відаць, маладыя падчас вясельнай фотасесіі.

У хуткім часе накіроўваемся назад, у Сапоцкін. Аглядаючы прыгожае наваколле, стаўлю мэту праехаць уздоўж канала — а гэта ні многа ні мала 20 кіламетраў — і пабываць на ўсіх аб'ектах, што ёсць у гэтых цудоўных мясцінах.

Маргарыта УШКЕВІЧ, фота аўтара.

На дыстанцыі

ЯК МЫ ПІСАЛІ «АГУЛЬНУЮ ДЫКТОЎКУ» АНЛАЙН

«А м-м-можна павольней, я запісваю?» — крылатая фраза з савецкай кінакласікі неаднаразова гучала ў мінулую суботу падчас традыцыйнай сацыяльна-асветніцкай акцыі «Агульная дыктоўка», якая ўжо чацвёрты раз аб'яднала прыхільнікаў беларускай мовы. Дакладней, гэтая фраза гучала б, калі б мы — удзельнікі і арганізатары — па добрай завядзёнцы сабраліся ў зале Нацыянальнай бібліятэкі. Аднак з-за неспрыяльнай эпідэміялагічнай сітуацыі сёлета праект упершыню праходзіў анлайн у прамой трансляцыі на платформе YouTube, а таму просьбы «чытайце павольней, калі ласка» даводзілася пісаць у чат-акенцы, у той жа час працягваючы пісаць ад рукі дыктоўку, — такая вось вымушаная эквілібрыстыка...

Сацыяльная ініцыятыва, якую здзяйсняе вядомы айчынны брэнд «Лідскае піва», сёлета наогул мела асаблівае значэнне. І не толькі таму, што адбывалася дыстанцыйна (хочацца верыць, першы і апошні раз). Па-першае, праект атрымаў дабрачынны характар: за кожнага, хто 6 чэрвеня выйшаў анлайн і напісаў дыктоўку, арганізатары пералічаць на рахунак Мінздароўя ў падтрымку медыкаў, якія працягваюць барацьбу з COVID-19, па пяць беларускіх рублёў — плюс дадатковую суму за «выдатнікаў», чые ацэнкі будуць роўныя 9 і 10. А па-другое — і, магчыма, гэта вынікае з першага — «Агульная дыктоўка — 2020» паставіла рэкорд па колькасці зарэгістраваных удзельнікаў: звыш 2300 чалавек з 20 краін свету заявілі пра намер праверыць веданне беларускай і падтрымаць як родную мову, так і медыцыну. Сярод тых, хто меркаваў наноў адчуць сябе на важнай кантрольнай, хай сабе і за віртуальнай партай, былі прадстаўнікі ўсіх рэгіёнаў Беларусі (найбольш актыўнай сталі Мінская, а таксама Гродзенская, Брэсцкая і Віцебская вобласці); акрамя таго, зазначае **менеджар па карпаратыўных камунікацыях ААТ «Лідскае піва» Надзея ЗВОНІК**, былі рэгістрацыі з Расіі і Украіны, ЗША, Канады, Польшчы, Чэхіі, Францыі, Германіі, Аўстрыі, Бельгіі, Эстоніі, Турцыі.

...На гадзінніку без пяці поўдзень. Падрыхтаваўшы аркуш і ручку, папярэджваю дамашніх, што на гадзіну мяне ні для кога няма, і пераходжу па спасылцы, дасланай арганізатарамі ў адказ на рэгістрацыю. Удзельнікі ўжо вітаюцца і называюць, адкуль яны: Мінск, Ліда, Ваўкавыск, Полацк, Буда-Кашалёва, Бабруйск, Глыбокае, Віцебск, Маладзечна, Брэст, Барысаў, Мазыр, Смалявічы, Магілёў — а следам блізкае і далёкае замежжа, ад Расіі да Іспаніі. Міжволі кідаю позірк на лічыльнік карыстальнікаў, якія глядзяць трансляцыю ў прамым эфіры, і спачатку засмучаюся — усяго каля тысячы, нашмат менш, чым было зарэгістравана, — але тут жа прыходзіць думка, што, верагодна, многія пішуць сем'ямі і сяброўскімі кампаніямі, таму падключэнне можа быць адно, а колькасць удзельнікаў большая. Зрэшты, хутка становіцца не да падлікаў і разваг — трансляцыя пачынаецца. «Вітаю! У 2016 годзе наш брэнд стаў беларускамоўным, і мы ўсур'ёз задумаліся над праектам, які змог бы аб'яднаць вакол сябе вялікую колькасць беларускамоўных людзей, — звяртаецца да ўдзельнікаў **генеральны дырэктар ААТ «Лідскае піва» Аўдрыус МІКШЫС.** — У 2017-м мы ўпершыню запрасілі ўсіх у Нацыянальную бібліятэку, каб напісаць «Агульную дыктоўку». Вітанні і пажаданні плёну ўдзельнікам перадаюць філолаг праекта Іна Хазеева і куратары акцыі ад кампаніі-арганізатара, і пад напамін, наколькі важна сёння нават на дыстанцыі заставацца разам, мы, размяўшы адвыклыя ад ручкі пальцы, запісваем назву тэксту: «Легенда пра аленя». Дзіўнае адчуванне — нібыта больш чым праз 20 гадоў пераносішся ў школу, за трэцюю парту каля сцяны, хіба толькі сусед ззаду не тыцкае ручкай пад лапатку: «Чуеш, а тут кропка ці клічнік?»...

Тэмай дыктоўкі 2020-га сталі традыцыі і карані. Арганізатары абралі тэкст сучаснай пісьменніцы з Гродна Марыі Цітарчук — здавалася б, нескладаны, але поўны вельмі прыгожых, сакавітых беларускіх слоў, што выразна паказала чытанне яго ўслых. Праўда, чытальнік — саліст папулярнага рок-гурта Nizkiz Аляксандр Ільін — здаецца, хваляваўся больш за нас, таму крыху блытаўся, то спяшаўся, то замаруджваўся (відаць, якраз пасля чарговых анлайн-просьбаў «павольней, калі ласка»). Зрэшты, часу на самаправерку і нават на тое, каб перапісаць работу на чыставік, было досыць — фатаграфіі і адсканаваныя копіі дыктовак прымаліся па электроннай пошце да 15 гадзін 6 чэрвеня. Вызначыць свае шанцы на ўваходжанне ў лік выдатнікаў можна ўжо цяпер — на сайце арганізатараў «Агульнай дыктоўкі — 2020» выкладзены тэкст цалкам. (Эх, не быць мне з дзвюма пунктуацыйнымі памылкамі «дзясятачніцай»! — **Аўт.**) Але канчатковых вынікаў акцыі давядзецца пачакаць: ацэнкі, гэтаксама як сума дабрачыннай дапамогі ўрачам, будуць абвешчаныя да 19 чэрвеня ўключна.

І ўсё ж не гэта галоўнае. Галоўнае ў тым, што колькасць людзей, зацікаўленых беларускай мовай, штогод расце, што праект ад шчырага сэрца падтрымліваюць выдатныя прадстаўнікі нашай культуры — гурты Naviband і Shuma, рэжысёр Іван Пінігін, акцёры Купалаўскага тэатра, пісьменнікі Міхаіл Валодзін, Андрэй Горват і Людміла Рублеўская, папулярныя тэле- і радыёвядучыя, і таму «Агульная дыктоўка» — ужо не мода, а новая традыцыя і, калі хочаце, патрэба для ўсіх, хто помніць, шануе і любіць родную мову і літаратуру. Хіба не?

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.
Скрыншот lidskae.by.